Отдел по образованию Шумилинского райисполкома
Государственное учреждение дополнительного образования
”Шумилинский районный центр детей и молодежи“

# Я гэты край Радзімаю заву

Сборник поэтических произведений

Составитель:
Муравьева Тамара Николаевна,
методист Шумилинского РЦДиМ

Шумилино, 2019

Рецензент:
директор государственного учреждения дополнительного образования ”Шумилинский районный центр детей и молодежи“ Р.А. Туманова
Составитель:
методист Т.Н. Муравьева

Рекомендовано
методическим советом ГУДО ”Шумилинский районный центр детей и молодежи“
14 января 2019 года, протокол №4

**Я гэты край Радзімаю заву** / Сборник поэтических произведений / сост. Т.Н. Муравьева ; Шумилинский районный центр детей и молодежи. – Шумилино, 2019. – 37 с.

В данном сборнике представлены поэтические произведения учащихся учреждений образования Шумилинского района, посвященные своей малой родине.

Сборник адресован педагогам дополнительного образования, классным руководителям.

Государственное учреждение дополнительного образования ”Шумилинский районный центр детей и молодежи“

## Змест


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 4 |
| Я люблю мой Шумілінскі край. *Кахтэнка Лідзія* | 5 |
| Шуміліна. *Шаблін Яўген* | 7 |
| История родного города. *Семёнова Юлия* | 8 |
| Гімн Шуміліншчыне. *Шабанава Аляксандра* | 10 |
| Мая Шуміліншчына. *Валекава Алёна* | 12 |
| Родныя краявіды. *Чарнічэнка Андрэй* | 13 |
| Малая родина. *Васильева Светлана* | 15 |
| Усё міла мне. *Фёдараў Леў* | 16 |
| Родны кут. *Сопат Яўгенія* | 18 |
| Люблю і мару…. *Несцерава Крысціны* | 19 |
| Цудоўны край. *Чарнічэнка Андрэй* | 20 |
| Родная зямля. *Фёдараў Леў* | 21 |
| Мая старонка. *Каротчанка Надзея Аляксандраўна* | 22 |
| Радзімы кут. *Валекава Алёна* | 23 |
| Родная старонка. *Рымша Ілья* | 24 |
| Мой родны кут. *Міхайлычава Аляксандра* | 25 |
| Успаміны. *Мальцава Марына* | 26 |
| Мая радзіма. *Каротчанка Надзея Аляксандраўна* | 28 |
| Любите деревню. *Литвинова Анна* | 29 |
| Думкі на лясной сцяжынцы. *Цобанава Ганна* | 30 |
| Отчий дом. *Ивановский Антон* | 31 |
| Песня о доме. *Петкевич Карина* | 32 |
| І гэта завецца радзімай. *Шабліна Дзіяна* | 33 |
| Родныя мясціны. *Пятрова Аляксандра* | 34 |
| Моему городу. *Скользаева Дарья* | 35 |
| Зямля пад белымі крыламі. *Ермаловіч Карына* | 36 |

## Уводзіны

2018 год – аб’яўлены Годам малой радзімы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў: ”Для адных малая радзіма – гэта родны горад, вуліца ў горадзе або невялічкі дворык, вёска, дзе прайшлі лепшыя дзіцячыя гады, для другіх – кавалак дзікай прыроды, які радаваў вочы і дарыў пачуццё напоўненасці і цішыні. А для тых, хто паехаў шукаць шчасце ў іншыя краіны, малой радзімай стала Беларусь“.

Радзіма даруецца чалавеку ад дня яго нараджэння, і пачуццё любові да яе можна сказаць прыроджанае, яно жыве ў крыві і сэрцы чалавека. Згадайма славутыя словы Францыска Скарыны: ”… тако же и люди, и где зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають“.

У вялікай краіне ў кожнага чалавека ёсць маленькі куточак – вёска, вуліца, дом, дзе ён нарадзіўся. Гэта яго малая радзіма.

Малая радзіма – гэта месца, якое дае сілы жыць; месца, дзе паветра напоўнена энергіяй і святлом; месца, куды заўсёда цягне вярнуцца.

Малая радзіма – гэта мяккія пераліві ранішняга неба над гарызонтам, зяляніна распасцёртых палёў, арамат сасновага бору, самотны крык жураваў.

Малая радзіма – гэта краявіды, людзі, побыт, народ, мінулае…

Малая радзіма – бясконца дарогі і незаменны свет, з якім звязаны самыя яркія ўражанні. У родных мясцінах чалавек чэрпае новыя сілы, узнаўляе запасы духоўнай энергіі.

Дадзены матэрыял з’яўляецца вынікам правядзення раённага конкурсу паэтычных твораў ”Рыфма. by“ (намінацыя ”Мой родны кут, як ты мне мілы!..“) і конкурсу дзіцячага малюнка ”Родныя краявіды“

Зборнік адрасаваны педагогам дадатковай адукацыі, класным кіраўнікам.



Я люблю мой Шумілінскі край!
Ён, як маці, адзіны, святы!
Не патрэбны замежны мне рай.
І вярнуся я толькі сюды.

*Кахтэнка Лідзія, 13 гадоў*

## Я люблю мой Шумілінскі край

Я люблю мой Шумілінскі край,
Мой зялёны, блакітны, прыгожы,
Дзе вясёлы і сонечны май
На малодзенькім лісці варожыць.
Я люблю мой Шумілінскі край,
Дзьмухаўцы, канюшыну, рамонкі.
Шчэбет птушак вясёлы. Пазнай
Салаўя раніцой голас звонкі.
Я люблю мой Шумілінскі край –
Мае першыя крокі і сцежкі.
Дружбакоў мне надзейных парай,
Каб дзяліць з імі радасць і ўсмешку.
Я люблю мой Шумілінскі край.
Тут жывуць людзі праўдай і верай.
Тут не здрадзяць нікому.  Ты ведай:
Госця стрэнуць дабром і даверам.
Я люблю мой Шумілінскі край!
Ён, як маці, адзіны, святы!
Не патрэбны замежны мне рай.
І вярнуся я толькі сюды.

**Кахтэнка Лідзія, 13 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза*
*П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна"*

## Шуміліна

Гарадок мой – Шуміліна – мілы сэрцу куток,
Хоць, здаецца, нічым не прыметны.
Ды тут сэрца маё, тут радзіма мая,
І пасёлак мой шмат чым адметны.
Шмат мінула гадоў, шмат вады ўцякло,
Як узнік мой пасёлак над возерам.
Быў ён сведкам сівой даўніны і вайны,
А яшчэ – над ім неба з просінню.
І няхай яму хутка паўтараста гадоў,
Мой пасёлак усё маладзее.
Не пазнаеш шмат вуліц, шмат сквераў, дамоў,
Тут усё на вачах прыгажэе.
Палюбуйся – вось новая школа мастацтваў,
І спартыўная школа будуецца.
І зусім не паверыш вачам,
Калі выйдзеш на цэнтральную вуліцу.
Новы храм тут узнёс купалы да нябёс,
Гэта будзе царква Мікалая.
Цудатворца дарue нам мір і спакой,
Бо зямля нашых продкаў святая.

**Шаблін Яўген, 13 гадоў,**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза*
*П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна“*

## История родного города

Город наш красивый, мирный,
Сердцу милый и родной.
Он в боях непобедимый,
Любим мы его с тобой.
Историю ты зочешь знать про город,
В котором ты живешь который год?
Тогда садись удобно,
Я расскажу тебе подробно,
Что пережил шумилинский народ.
Когда-то был здесь лес и поле…
Француз здесь как-то проходил.
Война была за жизнь без боли,
За тех, кого солдат любил.
В боях сражались прадеды и деды –
Солдаты самых разных возрастов.
За то, чтоб одержали мы победу,
Был каждый жизнь отдать готов.
Когда прошли, утихли грозы,
Трудились, жили, кто как мог.
Там, где шумели клены и березы,
Воздвигся чудный городок.
Здесь множество красивых улиц,
Прекрасных садиков, домов.
И в нашем городке большом
Живет и трудится народ!
У нас здесь есть музей героям,
Отдавшим жизнь за наш покой.
Мы вечно будем благодарны
За небо мирное над головой!

**Семёнова Юлия, 13 лет,**
*Государственное учреждение образования*
*"Средняя школа №1 имени Героя Советского Союза П.А. Акуционка г.п. Шумилино"*



**”Святыні Шуміліншчыны. Пяценка“**
Блізнец Кацярына, 13 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Сярэдняя школа №2 імя А.І. Дубасарскага г.п. Шуміліна“*

## Гімн Шумілiншчыне

У кожнага свая Радзіма,
У кожнага свой родны кут,
Дзе так усё пявуча, міла,
Дзе думкі ціхенька плывуць.
        Тут белымі здаюцца ночы,
        Здаецца шчасцем кожны дзень,
        Куточак родны і пяшчотны,
        Цябе я слаўлю дзень у дзень!
Хоць карта морамі заліта,
Раўніны, горы і лугі,
Найлепш Шумілiншчыны нашай
Я ў свеце не магу знайсці!
        Так добра мне тут і ўтульна,
        Дзе нарадзілася, жыву,
        Я ”патрыёткаю“ завуся,
        Бо ведаю тут кожны кут!
Мне васілёчак сінявокі
Здалёк ківае галавой,
Вясенні подых навальнічны
Тут навявае мне спакой.
        Мне падабаецца, як летам
        Плюскоча ў возеры вада,
        Як на палетках хлебаробаў
        Аддзячыць зернем збажына.
А восенню ад яблык спелых
Аж гнецца голле да зямлі,
І рэхам грыбнікоў заўзятых
Мне адгукнецца лес стары.
        Мяне здзіўляюць людзі працы
        Сваёй адданасцю, цяплом,
        З якім яны ўзбагачаюць
        Наш родны кут, наш родны дом.
Пра землякоў сказаць магу я,

Як пра надзейных дружбакоў,
Што ў складаныя часіны
Руку падаць любы гатоў.
Квітней жа, родная старонка,
Жыві, працуй і працвітай!
Красуй, Шумілiншчына-зорка,
Бяды і гора не пазнай!
Цябе ж заўсёды буду помніць,
Куды б мяне не кінуў лёс,
Той мізэрны куточак свету,
Дзе ты, і я, і ён узрос.

**Шабанава Аляксандра, 13 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Слабадская дзіцячы сад - сярэдняя школа*
*Шумілінскага раёна“*



**”Прыгажосць зямлі Шумілінскай“**
Жураўлёва Яна, 15 год
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Сярэдняя школа №2 імя А.І. Дубасарскага г.п. Шуміліна“*

## Мая Шумілiншчына

Мая Шумілiншчына- гэта поле і лясы,
Азёры з чыстаю, нібы сляза, вадою,
Жытнёвыя ў полі каласы,
Блакіт бяздонны над табою.
Дол іглісты ў бары,
А сонца - матулі ўсмешка,
Шчодрыя на ўраджай сады,
На ўзлессі - сіняя пралеска.
У хвойніку шуміць гуллівы ветрык,
У полі бязмежным гудуць трактары,
Прыгажэе, квітнее палетак,
Звісаюць долу цяжкія каласы.
Да болю блізкія мясціны:
Мой дом, гімназія, у якой вучуся я,
Там чырванеюць полымем рабіны,
А пад акном - бярозак дружная сям'я.
Усё мне дорага і міла
У нашай роднай старане,
Шумілiншчына мяне ўзрасціла,
Няхай шчаслівы лёс яе не абміне.

**Валекава Алена, 14 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Шумілінская раённая гімназія-інтэрнат"*

## Родныя краявіды

Якой сцяжынкай ні пайду,
Якой дарогай ні паеду,
У спадарожнікі бяру
Малюнкі родных краявідаў.

Уллянка-рэчка, дзе лаўлю
Я часам шчупакоў з сябрамі,
Здалёк, убачыўшы мяне,
Прыветна мне зайграе хваляй.

А цёмны хвойнік ля шашы,
Мой даўні верны субяседнік,
Як быццам кліча:
"Адпачні ў засені маіх ялінак".

Узгорак, возера ці гай –
Усё і не пералічу.
Сваю любоў, мой родны край,
Табе я выказаць хачу!

**Чарнічэнка Андрэй, 13 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Обальская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза*
*З.М. Партновай Шумілінскага раёна"*



**”Цішыня над возерам“**
Ільінец Карына, 11 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Сярэдняя школа №2 імя А.І. Дубасарскага г.п. Шуміліна“*

## Малая родина

Родилась я в маленьком селе:
Домик с домиком играют в прятки.
И не в каждом стареньком дворе
Бегают задорные ребятки.
Выхожу весенним тёплым днём,
Улыбаюсь утреннему солнцу.
И пойдём мы с ним вдвоём
Навестить любимую околицу.
Как красивы юные цветы.
Они рады нашему приходу.
Машут нам листочками кусты.
Как прекрасна всё-таки природа.
Невозможно передать словами,
Как блаженство за душу берёт.
Невозможно всё объять руками.
Чувство гордости из глубины идёт.
И когда-нибудь, покинув местность,
Не забуду милые края.
Я, соскучившись, и с солнцем вместе
Обязательно вернусь сюда.

**Васильева Светлана, 12 лет**
*Государственное учреждение образования*
*”Амбросовичская детский сад – базовая школа*
*Шумилинского района“*

## Усё міла мне

Абшар шумілінскіх прастораў,
Чароўныя квяцістыя лугі,
Зялёныя лясоў узоры,
У полі скірды і стагі.
        Крыніц празрыстую вадзіцу,
        Прыемна-свежы ў лесе цень,
        І цёплы дождж, і навальніцу,
        Люблю ў спякотны летні дзень.
На ўзлеску белыя бярозы,
І васількі, што ў збажыне,
Снег, завірухі і марозы, -
Усё дарага і міла мне.
        Зямля бацькоў мяне чаруе,
        У знямозе сілы прыдае.
        Усе памылкі мне даруе,
        Загоіць раны ўсе мае.
А калі зноў вайной хто мроіць,
Мая зямля пад ім гарыць.
Шумілiншчына не даруе
Тым, каму цяжка ў міры жыць.
        Я так хачу, каб сонца ззяла,
        Каб навакол сады цвілі,
        Каб шэрая зязюля кукавала.
        І каб буслы гняздо вілі.
І каб жыла і харашэла
Мая Айчына- Беларусь,
Каб светлу будучыню мела,
За гэта Богу я малюсь.

**Фёдараў Леў, 16 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза*
*П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна"*



**”Родная школа“**
Фядотаў Міхаіл, 12 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна“*



**”Зімой ля школы“**
Доўгіна Карына, 12 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна“*

## Родны кут

Мой родны кут,
Мая радзіма,
Куточак сіненькіх азёр.
Мой родны кут,
Дзе немагчыма
Забыць пра велічны прастор.
    Мой родны кут,
    Маё багацце,
    Мая прыгожая зямля.
    Мой родны кут
    Ты маё шчасце.
    Тут назаўжды застануся я.
Мой родны кут,
Мае прасторы,
Блакіт нябеснай вышыні.
Мой родны кут, лясоў узоры
На маёй велічнай зямлі.
    Мой родны кут,
    Мой лёс шчаслівы,
    Як песні птушак па вясне.
    Мой родны кут,
    Дзе плачуць івы
    І не даюць забыць цябе.

**Сопат Яўгенія, 11 год**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Слабадская дзіцячы сад - сярэдняя школа*
*Шумілінскага раёна“*

## Люблю і мару…

Люблю, зямля, твае малюнкі,
Што адкрывае далягляд,
Людзей чароўную гаворку
І наймілейшы іх пагляд.
Люблю буслова клекатанне
На даху нашага хлява,
Люблю глухое булькатанне
Вады ў талых ручаях.
Люблю, калі вясновым раннем
Ідзеш па свежанькай траве
І чуеш жаўруковы спевы,
Як гімны свету і вясне.
Люблю збіраць рукой руплівай
Сярод пажоўклых каласоў
Букецік самых мілых красах -
Блакітнавокіх васількоў.
Люблю глядзець, як восень шчодрым
Малюе пэндзлем па лясах,
Як журавы перад адлётам
Збіраюцца па балатах.
Люблю зімой прайсці па лесе,
Калі ўсё ў шэрані стаіць,
Калі вакол у марознай скрусе
Усё пад месяцам гарыць.
Люблю, люблю, люблю… і мару,
Каб паўсямесна і заўжды
Страшэнныя вайны пажары
Не разбурылі той красы.


**Несцерава Крысціна, 15 гадоў**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Слабадская дзіцячы сад - сярэдняя школа*
*Шумілінскага раёна“*

## Цудоўны край

Я бываў у Нясвіжы і ў Мінску,
Віцебск, Полацк паспеў палюбіць,
Шмат пабачыў мясцін беларускіх,
Прыгажосць якіх мне не забыць.
Ды бліжэй і радней тое месца,
Нарадзіўся дзе я і жыву.
Наш шумілінскі край, скажу чэсна,
Прыгажэйшым у свеце лічу.
Сціплы край, ды па-свойму цудоўны:
Белай роўняддзю вабіць зімой,
Буйнай зеленню радуе ўлетку,
Пахам смачным – асенняй парой.
Што наперадзе – я не ведаю.
Як складзецца далейшы мой лёс?
Але помніць заўсёды я буду,
Родны край, што мне шчасце прынёс!

**Чарнічэнка Андрэй, 14 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Обальская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза*
*З.М. Партновай Шумілінскага раёна“*




**”Чыгуначны вакзал ст. Шуміліна“**
Міляк Дар’я, 14 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Кардонская сярэдняя школа Шумілінскага раёна“*

## Родная зямля

Край дрымотных лясоў,
Што Шумілінам званы, -
Край бацькоў і дзядоў, дарагая зямля.
Ззяюць вочы азёр:
Будавесці, Развана, -
Шамаціць збажына на калгасных палях.
Пад нагамі трава
Мякка сцелецца, уецца.
Каля самых дарог каня плача, крычыць.
А ў прасторах вышынь
Песня жаўранка льецца.
Ты паслухай яе, пасядзі, памаўчы.
Усё мне дорага тут,
Маё сэрца кранае.
Ты – мой боль, мая радасць, надзея мая.
Ты, радзіма мая,
Як матуля другая.
Я – твой сын, я – дажджынка, расінка твая.
Я за вёску пайду
Чэрвеньскім надвячоркам,
Дзе хавае туман таямніцы свае.
Пастаю ў цішыні
Я на ”Лысым“ пагорку…
Няхай песні ўсю ноч дорыць мне салавей.
А я іх перашлю
Людзям роднага краю,
Без якіх я адзін існаваць не магу,
Тым, хто вучыць мяне,
Хто мяне настаўляе
І натхняе мяне на жыццёвым шляху.

**Фёдараў Леў, 15 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Шумілінская раённая гімназія–інтэрнат“*

# Мая старонка

*Прысвячаецца малой Радзіме*

На прыгожай пастаўскай зямлі,
Дзе пашчасціла мне нарадзіцца,
Дарагога юнацтва ажываюць сляды,
Мая старонка часта сніцца.
Хочацца сэрцам абняць і душой
Луг, поле, рэчку Заражанку.
Туга не аслабне да родных краёў,
Дзе ражок пастыра абуджаў спазаранку.
Дарогі ўсе вядуць туды,
Каб ад журбы знайсці прытулак.
Там усе знаёмыя заўжды,
Бацькоўскі дом – ад бед ратунак.
Заўсёды ў памяці жыве,
Калыска дум маіх шчаслівых.
Праз гады сэрца пранясе
Аблічча і справы продкаў мілых.
Вярнуся зноў з усіх дарог
Падзяліцца ліхою бядою.
Душа рвецца на родны парог
Ехаць зноў да матулі сваёю.
Мая Пастаўшчына – край ціхі, дарагі,
Куточак любы ў сусвеце.
З павагай сустракаюць землякі
На бацькоўскай спрадвечнай планеце.

**Каротчанка Надзея Аляксандраўна,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Шумілінская раённая гімназія-інтэрнат“*

## Радзімы кут

Радзіма, кут родны – чароўныя словы.
Для кожнага – гэта пачатак, аснова.
І дзе б ты ні быў, ты вяртаешся зноў
Туды, дзе твой дом, да сваіх каранёў.
Там сонейка самае-самае яркае,
І рэдка атулена шэрымі хмаркамі,
А неба заўсёды там чыстае-чыстае,
Рачулкі, азёры, як слёзы, празрыстыя.
Край запаветны, дзе нарадзіўся і рос,
Яго да нябёсаў высока б узнёс.
Пясняр Беларусі ад сэрца пісаў
Пра кут мілы, дзе душой спачываў.
І я сваё Шуміліна люблю,
Бо тут жыву, вучуся і расту.
І толькі тут знаходжу я спакой.
Ганаруся вельмі роднай зямлёй.
І куды б ні закінуў лёс мяне,
Прысягну на вернасць толькі табе.

**Валекава Алена, 15 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Шумілінская раённая гімназія-інтэрнат“*



**”Раніцай на возеры“**
Лазука Яўген, 11 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сярэдняя школа №2 імя А.І. Дубасарскага г.п. Шуміліна“*

## Родная старонка

Люблю старонку родную:
Нябёсаў чысціню,
Рачулку гаманлівую,
Лясоў, бароў красу.
І птушак спевы звонкія
Гучаць на ўсе лады,
Жытнёвыя палеткі
Тут спеляць каласы.
На полі безліч кветак
Чакаюць нас с табой.
Збяры букет валошак,
Нясі хутчэй дамой!
Грыбоў і ягад многа
Ты знойдзеш у лясах,
Крыніц крыштальна чыстых
Адчуеш пах і смак.
Людзей надзейных, шчырых
Сустрэнеш ты ў нас.
Прыйдуць на дапамогу,
Калі настане час.
За гэта ўсё старонку
Я родную люблю.
А прыйдзе час –
Заўсёды яе абараню!

**Рымша Ілья, 12 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Обальская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза*
*З.М. Партновай Шумілінскага раёна"*

**Мой родны кут**

Знікаюць зоркі раніцой,
Я прачынаюся
З узнёслай думкай:
– Ты са мной, мой родны кут, зямля мая!
    Навокал усё знаёма мне –
    Птушыны спеў,
    Нясмелы сонечны прамень, трава ў расе,
    Хмызняк ля возера,туман…
Сунічны пах, дыван лугоў,
Садоў ружовы цвет
Натхненне далі прашаптаць :
– Бацькоў зямля,такой, як ты, нідзе няма!
    Ля весніц плот, за ім прастор.
    Куды ні глянь –
    Лясы, палі, праз іх шляхі
    Ажно за небакрай.
А мне не трэба іншы край.
Маё жыццё з табой,
Мой родны кут, мая зямля,
Мой лёс, мая любоў!

**Міхайлычава Аляксандра, 12 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Слабадская дзіцячы сад -*
*сярэдняя школа Шумілінскага раёна"*

**Успаміны**

Мая любімая старонка,
Табе аддана я душой,
І часу вольнага хвілінка
Пакліча зноў мяне дамоў.
Там сустракае маці, тата,
Сястра, бабуля, кот Барыс,
А на стале стаіць гарбата
І пышных ладак цэлы стос.
І пойдзе гутарка заўзята
Пра час мінулы і былы,
І выпадкаў прыйдзе багата
На памяць кожнаму тады.
Успомніцца, як колісь летам,
Хадзілі гуртам у грыбы,
І як малін духмяных з татам
Збіралі поўныя кашы.
А як цудоўна мы гулялі
У час Купалля ля ракі
І з кладкі на ваду пускалі
Свае чароўныя вянкі.
Як восенню ўраджай багаты
Збіралі ў полі ля ракі
І з гонарам вязлі дахаты
Капусту, моркву, буракі.
Як па сняжку сыпучым, белым
Хадзілі вёску віншаваць
Бо на Калядкі, так прынята,
Патрэбна шчасця ўсім жадаць.
Вось за акном вясна спявае
На ўсе птушыныя лады,
І ветрык з поўдня павявае,
І сонца грэе з вышыні.
О, як цудоўна зноў вярнуцца

Туды, дзе родны кожны куст,
Дзе сэрцам можна прытуліцца
І да зямлі, і да бяроз.
Зімой сцюдзёнай  і ўвесну,
Калі бруяцца ручайкі,
Спякотным летам і ўвосень,
Калі ў золаце гаі,-
Заўжды  радзімая старонка
Бы маці к сэрцу прыгарне,
І прыгалубіць, і абдыме,
І столькі шчасця  прынясе.
А я, старонка дарагая,
Цябе шаную без канца,
Бо не патрэбна мне другая,
Хоць і заморская  яна.

**Мальцава Марына, 13 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Слабадская дзіцячы сад - базавая школа*
*Шумілінскага раёна“*



**”Сведка падзей“**
Загвоздава Аліна, 16 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Сярэдняя школа №2 імя А.І. Дубасарскага г.п.*

**Мая Радзіма**

Цёплая, шчырая,
Адкрытая,
Стужкамі рэк апавітая,
Мая Радзіма.

Галасістая, звонкая,
Непаўторная,
Шчасцем напоўненая,
Мая Радзіма.

Стваральная, сардэчная,
Самаадданая,
Ідэяй міру паяднаная,
Мая Радзіма.

Хлебная, белакрылая,
Усмешлівая,
Сэрцу мілая,
Мая Радзіма.

Гераічная, шматпакутная,
Легендарная,
Ліхалеццямі войн загартаваная,
Мая Радзіма.

Упартая, цярплівая,
Працавітая,
Душою адкрытая,
Мая Радзіма.

Гордая, бясстрашная,
Узнёслая,
Палыном бяспамяцтва не парослая,
Мая Радзіма.

Ціхая, крынічная,
Вечная,
Спевам жыцця ўвекавечаная,
Мая Радзіма.

**Каротчанка Надзея Аляксандраўна,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Язвінская дзіцячы сад – базавая школа Шумілінскага раёна“*

## Любите деревню

Деревню любили поэты,
Писали стихи здесь, сонеты.
Хвалили погоду, природу
И мыслями жили с народом.
Поместья богатыми были,
С соседями очень дружили.
Учили крестьянских детей -
И не было дела важней.
Промчались эпохи, столетья:
Было и затишье, и лихолетье.
Сменила деревня обличье,
Но есть и черты, и отличье.
Сегодня деревня не та:
Исчезли поэты и их ”суета“,
Дворцы превратились в руины,
Но в этом лишь люди повинны.
Сберечь бы историю для поколений,
Ведь больше не будет дворянских имений.
Напишет ли кто про Онегина Женю,
Который страдал от безделья и лени?
Хвалите деревню за близость к природе,
За то, что растёт всё в своём огороде,
За воздух, за лес и за речку вдали
На зависть Пикассо и Сальвадору Дали.
Хвалите деревню, где строится дом,
Где хлеб человек добывает трудом.
Колодец здесь есть, ключом бьёт вода.
Хватает всем места, любви и труда.
Любите деревню за стройность берёз,
За ветку сирени, за толику грёз.
Любите за то, что в этой тиши
Мы родину, душу и мир сберегли...

**Литвинова Анна, 15 лет**

*Государственное учреждение образования*
*”Новиковская базовая школа Шумилинского района“*

## Думкі на лясной сцяжынцы

О мой прыгожы беларускі лес!
Знаёмы мне твае жывёлы, птушкі,
Расліны (сярод іх ёсць нават дзікі бэз) –
Адданыя табе навекі служкі.
    Твая прырода litsнакаляровая:
    Тут шмат зялёнага, бы вечнаю вясной,
    Увосень чырвань, потым бель зімовая!
    Я спадзяюся: згодны ўсе са мной.
А гукі лесу! Што за асалода
Пачуць спеў птушак ці крынічны звон!
Ды і, згадзіцеся, якая то слаўнота –
Імчаць за шумным рэхам наўздагон!
    Такім вось бачыць лес жыхар вясковы,
    Яму, дарэчы, усё не ў навізну,
    Бо ходзіць часта ён па ягады, па дровы,
    Як і было ў старую сівізну.
А ты, жыхар бетону і асфальту,
Даўно наведваў навакольны лес?
Бяры сяброў, што думаюць пра Мальту,
Ідзіце слухайце лясны аркестр!

**Цобанава Ганна, 14 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Нікіціхінская сярэдняя школа*
*Шумілінскага раёна“*

## Отчий дом

Ведёт знакомая дорожка
К родному дому на горе.
И свет любимого окошка
Особо ярок на заре.
Всегда открыты в доме двери
Для тех, кто временно не тут.
Тебя здесь ждут, в тебя здесь верят
И никогда не предадут.
Здесь вкусно драниками пахнет,
Царит любовь здесь и уют.
И дома мы, когда нас нет,
И дома дважды, когда тут.
Нет места лучшего на свете,
Теплее, ласковей, милей.
Оно одно на всей планете -
Наш отчий дом, он всех родней.

**Ивановский Антон, 15 лет**

*Государственное учреждение образования ”Амбросовичская детский сад – средняя школа Шумилинского района“*



**”Вуліца імя Кароткіна“**
Лапаўхава Дар'я, 13 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна“*

## Песня о доме

Сложила я песню о доме.
Слова в ней простые до боли:
Семья, доброта и уют.
Дом - место, где все тебя ждут.
Все чувства просты и понятны.
И мысли звучат дома внятно.
Желания чище слезы:
Чтоб счастливы были все мы.
Грусть светлая в песне о доме,
О том, как вернешься ты снова,
Присядешь под вербой в тени.
Все станет, как в прежние дни.
Сложила я песню о доме,
А музыка к песне из поля -
Шум ветра в колосьях пшеницы,
Жужжание крыльев в метлице.
Мотив этой песни простой.
Он словно узор кружевной
Проснувшейся рано зари.
Его помню я, помнишь ты.
Споем эту песню с тобою
О нашем родимом доме.
О нашей любви к тому месту,
Где быстро проходит детство.

**Петкевич Карина, 16 лет**
*Государственное учреждение образования*
*"Средняя школа №2 имени*
*А.И. Дубосарского г.п. Шумилино"*

## І гэта завецца радзімай

У полі пшаніца гамоніць з ячменем,
рамонкі цвітуць удоль сцяжыны,
у небе разносіцца спеў жаўрукові.
І гэта завецца радзімай.
Над берагам рэчкі схіліліся лозы,
шапоча чарот гаманлівы,
а хвалі бягуць і іскрацца на сонцы.
І гэта завецца радзімай.
У лесе пад шатамі елак і сосен
разносіцца гоман птушыны,
тут водзяцца рысі, зубры і мядзведзі.
І гэта завецца радзімай.
А выйдзеш на луг: сонца, травы і кветкі,
і водар, і гул тут чмяліны.
А колькі на кветках сядзіць матылёчкаў!
І гэта завецца радзімай.
Усё, ад траў і да зорак,
ад кветкі да гронкі рабіны.
Усё, што цябе акружае,
Завецца тваёю радзімай.

**Шабліна Дзіяна, 11 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Добрынская дзіцячы сад – пачатковая школа*
*Шумілінскага раёна“*

## Родныя мясціны

Іду па знаёмых сцяжынках,
Усё роднае, блізкае мне,
Сумую па родных мясцінах,
Чакаю сустрэч па вясне.
Люблю я, канечне, быць дома,
Бо тут ажываю, цвіту.
Між родных, сяброў і знаёмых
Цвярдзей на нагах я стаю.
А маці, як толькі ўстане,
І печ раніцой раскладзе,
Не ўгледзіш, як рэшата яек
Яна для дзяцей прынясе.
Пралятаюць імкліва часіны,
Застаецца ўсё меней гадзін,
І ўжо хутка пад крык жураўліны
Ад'еду я з родных мясцін.

**Пятрова Аляксандра, 15 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Сярэдняя школа №2 імя*
*А.І. Дубасарскага г.п. Шуміліна"*



**"Шумілінская бібліятэка"**
Ермаловіч Юлія, 10 гадоў
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Кардонская сярэдняя школа Шумілінскага раёна"*

## Моему городу

Там, где бор шумел сосновый,
Давно построилось село.
Может быль, а может небыль,
Звалось Шумилино оно.
    Сто лет уже, а может больше,
    Стоит и радует людей
    Мой город, тихое местечко,
    И нет мне города милей!
Здесь мило всё: и гладь озёр,
И песен соловьиных трели,
И шум лесов, и ширь полей,
И смех детей на карусели.
    И, может быть, когда-нибудь,
    Придётся мне тебя оставить,
    Но жизнь без тихих улочек твоих
    Смогу ль навряд ли я представить!

**Скользаева Дарья, 14 лет**
*Государственное учреждение образования*
*”Средняя школа №1 имени Героя Советского Союза*
*П.А. Акуционка г.п. Шумилино“*



**”Памяць…“**
Мацюшчанка Анастасія, 14 гадоў
Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна“

**Зямля пад белымі крыламі**

Дзіўна, чаму гэта так?
Я ў сабе думку лаўлю.
Як адзінокі бядняк,
Я сярод поля стаю.
        А на душы весялосць,
        Быццам я – усемагутны ўладар.
        А ўладанні мае – прыгажосць,
        Велізарны ад Бога дар.
Хтосьці скажа: ”Нічога не маеш ты,
Акрамя адзіноты сваёй.
Але чаму улюбёная, ззяеш,
У чым прычына радосці тваёй?“
        Паглядзі, колькі золата маю,
        Ім заліты ўвесь небакрай.
        Ці ж няправільна я разважаю?
        Даражэй за яго – узгадай!
У жамчужынах белых аблокаў
Разліваецца сонейка ўсход.
А што золата, многа ў ім толку?
Ці пражыў ты без сонца хоць год?
        Бачыш, як хлеб каласіцца,
        Брыльянтамі росы блішчаць.
        Вось з гаючай вадою крыніца,
        Вунь бярозкі-сяброўкі стаяць.
Я шчаслiва, што ў суджаны час
Нарадзілась на гэтай зямлі,
Дзе такія спакойныя рэкі,
І такія густыя лясы.
        Дзе вясной зеляне́юць палі,
        І жаўрук наш звініць штогод.
        А ўладар гэтай дзіўнай красы –
        Мой народ, беларускі народ.
Бездань неба, прастор невыказны.
Тут свабоды -  сапраўдны смак.

Адным словам, дакладна, выразна,
Растлумачыць магу толькі так.
То Радзіма мая дарагая!
Я люблю яе, ёй ганарусь.
Разам з ёю ўжо не адна я,
А багацце маё – Беларусь.
Гэта ўсё мне яна падарыла,
Данясла пад ваенным агнём.
То зямля мая пад белымі крыламі,
Ты – мая, я – твая ва усім.

**Ермаловіч Карына, 16 гадоў**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*”Кардонская сярэдняя школа Шумілінскага раёна“*



**”Світанак над Шумілінам“**
Міронаў Вячаслаў, 14 гадоў
Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза П.А. Акуцыёнка г.п. Шуміліна“



